Міхаіл Орда

Зьвесткі зь Вікіпэдыі — вольнай энцыкляпэдыі

Міхаіл Сяргеевіч Орда (нар. 28 верасьня 1966, Зьдзецел, Гарадзенская вобласьць) — беларускі грамадзкі і палітычны дзяяч.

Біяграфія

Скончыў Віцебскі вэтэрынарны інстытут па спэцыяльнасьці вэтэрынарны лекар; Расейскую акадэмію дзяржаўнай службы пры прэзыдэнце Расейскае Фэдэрацыі па спэцыяльнасьці дзяржаўнае і муніцыпальнае кіраваньне.

Працоўную дзейнасьць пачаў сьлесарам у калгасе «Расея» Зьдзецельскага раёну. Служыў у радах Узброеных Сіл. Быў кіраўніком абласнога штабу студэнцкіх аддзелаў Віцебскае вобласьці, дырэктарам абласное службы добраахвотнае працы моладзі, прэзыдэнтам Рэспубліканскае асацыяцыі міжнародных моладзевых абменаў і турызму, другім сакратаром Цэнтральнага камітэту грамадзкага аб'яднаньня «Беларускі патрыятычны саюз моладзі» (да 2001).

27 сакавіка 2001 году вызвалены ад пасады другога сакратара ЦК Беларускага патрыятычнага саюза моладзі (вакансію заняў Аляксандар Далжэўскі) у сувязі зь пераходам на сталую працу дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь II скліканьня.

25 сакавіка 2003 году быў абраны першым сакратаром ЦК Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. 1 жніўня 2006 сышоў з паста кіраўніка БРСМ.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь 2-га (2000—2004) па Лідзкай сельскай выбарчай акрузе № 57 і 3-га скліканьняў (2004—2008). Абодва разы — намесьнік старшыні Сталае камісіі па

Міхаіл Орда



Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь	
2000 — 2012	
Прэзыдэнт:	Аляксандар Лукашэнка
Прэм'ер-міністар:	Уладзімер Ярмошын (да 1 лістапада 2001), Генадзь Навіцкі (да 10 ліпеня 2003), Сяргей Сідорскі (да 28 сьнежня 2010), Міхаіл Мясьніковіч
1-ы сакратар Беларускага рэспубліканскага саюзу моладзі	
25 сакавіка 2003 — 1 жніўня 2006	
Наступнік:	Ігар Бузоўскі
Асабістыя зьвесткі	
Нарадзіўся:	28 верасьня 1966 (56 гадоў) Зьдзецел, Гарадзенская вобласьць
Дзеці:	Сын і дачка
Бацька:	Сяргей Орда
Адукацыя:	Віцебскі вэтэрынарны інстытут, Расейская акадэмія дзяржаўнай службы

дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраваньні й рэглямэнце. У 2008 абраны ў Палату Прадстаўнікоў 4-га скліканьня.

Узнагароды:

Міхаіл Орда ў Вікісховішчы

Узнагароды

Узнагароджаны падзякай прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Адміністрацыі прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. 6 траўня 2022 году атрымаў мэдаль «За працоўныя заслугі», які ўручыў кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта Беларусі Ігар Сергяенка[1].

Сям’я

Жанаты, мае сына, дачку.

Крытыка, санкцыі ЭЗ

Паводле справаздачы, падрыхтаванай Польскім фондам свабоды й дэмакратыі, Міхаіл Орда прымаў удзел у фальсыфікацыі парлямэнцкіх і прэзыдэнцкіх выбараў, а таксама супрацоўнічаў з Камітэтам дзяржаўнай бяьспекі па пытаньнях палітычных рэпрэсіяў[2].

Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2010 году, 2 лютага 2011 году быў унесены ў Чорны сьпіс Эўразьвязу за ўдзел у меркаваных падлогах ды парушэньнях правоў чалавека[3].

20 лістапада 2020 году ўнесены ў санкцыйныя сьпісы Летувы, Латвіі ды Эстоніі[4].

Крыніцы

1. ^ Сергяенка ўручыў дзяржузнагароды прадстаўнікам розных сфэр за разьвіцьцё беларускай дзяржаўнасьці (https://blr.belta.by/society/view/sergjaenka-uruchyu-dzjarzhuznagarody-pradstaunikam-roznyh-sfer-za-razvitstse-belaruskaj-dzjarzhaunastsi-114491-2022/) // Беларускае тэлеграфнае агенцтва, 6 траўня 2022 г. Праверана 6 траўня 2022 г.
2. ^ Беларуская сыстэма рэпрэсіяў. Перасьледнікі ды іх ахвяры (http://web.archive.org/web/20131203002146/http://wid.org.pl/raport.pdf) = Białoruski system represji. Prześladowcy i ich ofiary / pod redakcją dr Dariusza Zalewskiego, Marka Bućko (pl), Michała Kurkiewicza i Tomasza Pisuli. — Warszawa: Fundacja Wolność i Demokracja, 2007. — С. 45. — 72 с.
3. ^ Поўны сьпіс 208 беларускіх чыноўнікаў, якім забаронены ўезд у ЕС (https://nn.by/?c=ar&i=61552) (бел.). Наша Ніва (2011-10-11). Архіўная копія (https://web.archive.org/web/20171022033809/https://nn.by/?c=ar&i=61552) ад 2017-10-22 г.
4. ^ Литва, Латвия и Эстония расширили санкционные списки белорусских чиновников (https://reform.by/181443-litva-latvija-i-jestonija-rasshiril-sankcionnye-spiski-belarusskih-chinovnikov) *reform.by* Праверана 2021-09-05 г.

Вонкавыя спасылкі

- Інфармацыя на сайце Палаты Прадстаўнікоў (https://web.archive.org/web/20081203185233/http://house.gov.by/index.php/,1173,4248,,,0,0,0.html)

- Профіль на праекце «Хто ёсьць хто ў РБ» (http://who.bdg.by/obj.php?&kod=363) (рас.) Архіўная копія (http://web.archive.org/web/20110901142252/http://who.bdg.by/obj.php?&kod=363)

Атрымана з «https://be-tarask.wikipedia.org/w/index.php?title=Міхаіл_Орда&oldid=2311382»